# ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| **Наименование (описание), местонахождение и стоимость имущества** | **Лот №1.** Колонки акустические Dynacord MT 215 (2 шт.) Первоначальная стоимость – 410 000 рублей. **Лот №2.** Усилитель Dynacord S 1200 (2 шт.) Первоначальная стоимость – 15 026 000 рублей. **Лот №3.** Усилитель Luxomat SW-02 (1 шт.) Первоначальная стоимость – 1 820 000 рублей. **Лот №4.** Усилитель Palladium 2000 (1 шт.) Первоначальная стоимость – 8 046 000 рублей. **Лот №5.** Колонки акустические Linear LP 112 (3 шт.) Первоначальная стоимость – 3 585 000 рублей. **Лот №6.** Световые лазерные установки Teclumen (2 шт.) Первоначальная стоимость – 9 116 000 рублей. **Лот №7.** Лампы неонового цвета (10 шт.) Первоначальная стоимость – 6 370 000 рублей. **Лот №8.** Шар электрический световой (1 шт.) Первоначальная стоимость – 1 245 000 рублей. **Лот №9.** Стулья барные (12 шт.) Первоначальная стоимость – 3 528 000 рублей. **Лот №10.** Мойки керамические (8 шт.) Первоначальная стоимость – 1 656 000 рублей. **Лот №11.** Водонагреватель электрический (1шт.) Первоначальная стоимость – 890 000 рублей. **Лот №12.** Фонари уличные (9 шт.) Первоначальная стоимость – 4 113 000 рублей. **Лот №13.** Кондиционер McQuay MLC025CR Acpoa (1 шт.) Первоначальная стоимость – 11 873 000 рублей. |
| **Собственник (владелец) имущества** | ОДО «БелЮрцМагистраль», УНП 391120443 |
| **Местонахождение (адрес) имущества** | Оршанский район, д. Юрцево, ул. Магистральная, 1 |
| **Информация об обременениях** | Без обременений |
| **Место (адрес), дата и время проведения торгов** | г. Орша, ул. Островского, 36, каб. 9 **13 мая 2016 года в 11.00** |
| **Справочная информация** | Отдел принудительного исполнения Оршанского района и г. Орши 211030, г. Орша, ул. Островского, 36 Главный специалист – Маханькова Анастасия Александровна, тел. 80216543205. |
| **Условия и порядок проведения торгов** | 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет отдела принудительного исполнения Оршанского района и г. Орши № 3642903000794 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 647, УНП 30002505, **не позднее 11.00 13.05.2016 г.** Минимальная величина первого шага – 5% стоимости каждого лота. В соответствии с ч. 3 ст. 401 ХПК Республики Беларусь возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги. |



# ОАО «Озтранс»

223021, Минский р-н, Щомыслицкий с/с, п/о Озерцо, Менковский тракт, 21. Тел./факс 507-61-31

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС ОАО «ОЗТРАНС» на 1 января 2016 года**

млн руб.

| АКТИВ | | ПАССИВ | |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. Долгосрочные активы** | **52493** | **III. Собственный капитал** | **26846** |
| Основные средства | 51814 | Уставный капитал | 26540 |
| Нематериальные активы | 0 | Добавочный фонд | 30 |
| Вложения в долгосрочные активы | 656 | Нераспределенная прибыль | 61 |
| Долгосрочные финансовые вложения | 1 | Чистая прибыль(убыток) отчетного года | 215 |
| Прочие долгосрочные активы | 22 | **IV. Долгосрочные обязательства** | **21008** |
| **II. Краткосрочные активы** | **9891** | Долгосрочные кредиты и займы | 20340 |
| Запасы | 55 | Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам | 668 |
| Расходы будущих периодов | 38 | **V. Краткосрочные обязательства** | **14530** |
| Налог по приобретенным ценностям | 4458 | Краткосрочные кредиты и займы | 12393 |
| Дебиторская задолженность | 5316 | Кредиторская задолженность | 2137 |
| Денежные средства | 17 | | |
| Прочие краткосрочные активы | 7 | | |
| **Баланс** | **62384** | **Баланс** | **62384** |

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ**

млн руб.

| | |
|---|---|
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 7404 |
| Себестоимость реализации товаров, продукции, работ, услуг, управленческие расходы | 7055 |
| Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ | 2707 |
| Прочие доходы по текущей деятельности | 1982 |
| Прочие расходы по текущей деятельности | 2045 |
| Прибыль (убыток) по текущей деятельности | 286 |
| Доходы по инвестиционной, финансовой деятельности | 199 |
| Расходы по инвестиционной, финансовой деятельности | 217 |
| Прибыль (убыток) по инвестиционной деятельности | -18 |
| Прибыль (убыток) до налогообложения | 268 |
| Налог на прибыль | 53 |
| Чистая прибыль | 215 |

**Информация об ОАО и его деятельности**

Доля государства в уставном фонде эмитента – -
Количество акционеров – 38, в т.ч.: юридических лиц – 1, физических лиц – 37.

**Информация о дивидендах и акциях**

| НАИМЕНОВАНИЕ ПОКАЗАТЕЛЕЙ | Ед. изм. | С начала года | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде | млн руб. | 0,27 | 0,00 |
| Фактически выплаченные дивиденды в данном отчетном периоде | млн руб. | 0,00 | 0,00 |
| Дивиденды приходящиеся на одну акцию (включая налоги) | руб. | 0,26 | 0,00 |
| Дивиденды, фактически выплаченные на одну акцию (включая налоги) | руб. | 0,00 | 0,00 |
| Обеспеченность акции имуществом общества | тыс. руб. | 25,24 | 25,16 |

**ОТДЕЛЬНЫЕ ФИНАНСОВЫЕ РЕЗУЛЬТАТЫ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ**

млн руб.

| НАИМЕНОВАНИЕ ПОКАЗАТЕЛЕЙ | С начала года | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|
| Выручка от реализации продукции, работ, услуг | 7404 | 4252 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, управленческие расходы, расходы на реализацию | 7055 | 4691 |
| Прибыль (убыток) до налогообложения | 268 | 8 |
| в т.ч: прибыль(убыток) от реализации товаров, работ, услуг, продукции | 349 | -439 |
| в т.ч: прочие доходы и расходы по текущей деятельности | -63 | 14 |
| в т.ч: прибыль(убыток) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности | -18 | 433 |
| Налог на прибыль; изменение отложенных налоговых активов, налоговых обязательств, прочие налоги исчисляемые из прибыли | 53 | 11 |
| Чистая прибыль (убыток) | 215 | -3 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | 61 | 64 |
| Долгосрочная дебиторская задолженность | 0 | 0 |
| Долгосрочные обязательства | 21008 | 839 |
| Среднесписочная численность работающих (чел.) | 25 | 24 |
| 9. Основные виды деятельности, по которым получено более двадцати процентов выручки от реализации: деятельность грузового автомобильного транспорта 42%, сдача в наем собственного недвижимого имущества 21% | | |

Дата проведения годового общего собрания акционеров, на котором утверждался бухгалтерский баланс з за 2015 год: 30 марта 2016 года.

Сведения о применении эмитентом свода правил корпоративного поведения: общество работает по утвержденному Уставу ОАО «Озтранс», Регламент работы с реестром владельцев ценных бумаг ОАО «Озтранс» утвержден на общем собрании от 30.03.2010 №13

**Директор ОАО «Озтранс»** **С.А. Сахарук**

**Главный бухгалтер** **Е.М. Балашевич**

**Данные отчетности подтверждены:** ИП Акулич Валентина Болеславовна, квалификационный аттестат аудитора №0000159 от 12.11.2002 года выдан Министерством финансов РБ, регистрационный № 158.


# МЫ — МОЖАМ!

## У кросе ў гонар славутага касманаўта-земляка ўдзельнічалі жыхары Чэрвеньшчыны

**Апошнім часам у Чэрвені, што на Міншчыне, ладзяць усё больш мерапрыемстваў, прысвечаных знакамітаму земляку, ураджэнцу гэтых мясцін, касманаўту Алегу Навіцкаму. І сімвалічна, што адбываецца гэта ў год яго мяркуемага другога палёту да зор.**

...Не паспелі яшчэ забыцца падрабязнасці першага касмічнага фестывалю, як новае мерапрыемства прапанаваў усім зацікаўленым аддзел адукацыі, спорту і турызму Чэрвеньскага райвыканкама. Сумесна з Беларускай федэрацыяй лёгкай атлетыкі дзяцей і дарослых запрасілі на лёгкаатлетычны крос імя Алега Навіцкага. І натуральна, што адбылося спартыўнае выпрабаванне не ў звычайны дзень тыдня, а ў святочны: у Сусветны дзень авіяцыі і касманаўтыкі, 12 красавіка.

Своеасаблівым паўнамоцным прадстаўніком знакамітага земляка стала яго маці, Валянціна Эдуардаўна Навіцкая.

365 удзельнікаў — неблагая для першага разу колькасць! — дзяліцца на дзве групы: юнакі і дзяўчаты. Яны будуць стартаваць асобна. Большасць — школьнікі. Перад імі — асфальтаваныя вуліцы горада, дыстанцыя ў паўтара кіламетра і такі жаданы, але пакуль яшчэ далёкі фініш — каля новага будынка фізкультурна-аздараўленчага комплексу «Ігумен», адкрытага мінулай восенню.

Гэта толькі здаецца, што паўтара кіламетра — дыстанцыя невялікая... Але нават калі п'едэстал гонару скарыўся не ўсім, нагоды для засмучэння няма. Галоўнае — кожны дабег і даказаў найперш сабе: "Я — магу!" Да таго ж, абсалютна ўсе спартсмены атрымалі на памяць сертыфікат удзельніка кросу імя Алега Навіцкага ад Беларускай федэрацыі лёгкай атлетыкі.

Былі, безумоўна, і ўрачыстыя фанфары ў гонар пераможцаў і прызёраў, граматы і медалі, якія ўручыла мама касманаўта.

**Ксенія УЛАДЗІМІРАВА.**

■ Будзь у курсе!

# ДЗІЦЯЧАЯ ЧЫГУНКА ЗАПРАШАЕ

**30 красавіка Дзіцячая чыгунка імя Канстанціна Заслонава Мінскага аддзялення Беларускай чыгункі адкрые свой чарговы, 61-й сезон.**



Цягнік «Сталічны экспрэс» будзе курсіраваць у маі па суботах і нядзелях, а таксама ў святочныя дні з 11.00 да 16.40. Летам ён будзе перавозіць сваіх пасажыраў па серадах, чацвяргах і пятніцах з 11.00 да 14.00, па суботах і нядзелях — з 11.00 да 16.40. У верасні праехацца ў «Сталічным экспрэсе» можна будзе па суботах і нядзелях з 11.00 да 16.40, паведамілі ў прэс-цэнтры Беларускай чыгункі. Цягам летняга перыяду па выхадных і святах пасажыраў цягніка на станцыі Заслонава будуць сустракаць казачныя персанажы, дзятву чакаюць розныя гульні, конкурсы і віктарыны. Апроч таго, кожную нядзелю пасажыры змогуць убачыць канцэрт калектываў аматарскай мастацкай творчасці культурна-спартыўнага цэнтра Мінскага аддзялення магістралі. Да Дня Перамогі і Дня Незалежнасці будзе падрыхтавана асобная святочная праграма.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
*rs@zviazda.by*

■ Падзея

# ПАСЛЯДОЎНІКІ АЛОЎНІКАВА

**У Бабруйску падвялі вынікі першага адкрытага рэгіянальнага конкурсу юных піяністаў у гонар славутага земляка.**

— Глыбока сімвалічна, што Год культуры прыняў эстафету Года моладзі, а журы конкурсу ўзначаліў сын нашага земляка, народны артыст Рэспублікі Беларусь, прафесар Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі Ігар Уладзіміравіч Алоўнікаў. Упэўнены, што ідэі, пакладзеныя ў аснову конкурсу, гарантуюць яму прапіску ў Бабруйску на доўгія гады. А мы станем сведкамі адкрыцця новых імёнаў, якія стануць гонарам нашай краіны і праславяць яе далёка за межамі, — адзначыў **Андрэй КАВАЛЕНКА, старшыня Бабруйскага гарадскога выканаўчага камітэта і адначасова старшыня аргкамітэта конкурсу**.

140 навучэнцаў дзіцячых школ мастацтваў з 16 гарадоў Магілёўшчыны два дні спаборнічалі за званне лепшага піяніста. У іх выкананні гучалі класічныя творы народнага артыста і заслужанага дзеяча мастацтваў БССР Уладзіміра Алоўнікава і іншых кампазітараў.

Абсалютнай пераможцай, якая атрымала Гран-пры конкурсу, стала Дар'я Рыдлевіч, вучаніца дзіцячай школы мастацтваў № 3 імя М.Н. Салдатава з Магілёва (настаўнік М. Малахава). Дыпломамі і грашовымі прэміямі таксама адзначаны лаўрэаты 1-й ступені ў 4 узроставых групах — Вера Касцюкевіч і Савелій Андрэеў з Магілёва, Аляксандра Арлоўская з Віцебска, Анастасія Тароп з Гомеля, Ангеліна Цабкала з Мінска, Аліна Салтыкова з Бабруйска, Соф'я Хацяновіч з Салігорска. Педагогі юных талентаў атрымалі граматы аргкамітэта і журы конкурсу за высокае педагагічнае майстэрства. А калектыву Бабруйскай дзіцячай школы мастацтваў № 2 імя У.У. Алоўнікава намеснік старшыні Бабруйскага гарвыканкама Аляксандр Маркачоў уручыў спецыяльны прыз — ноўтбук.

— Я ўдзячны гэтаму гораду, яго кіраўніцтву, школе за падтрымку нашай сям'і. Прыемна здзіўлены высокім узроўнем арганізацыі гэтага мерапрыемства.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

■

# ПАСЫЛКІ СХУДНЕЮЦЬ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Паводле статыстыкі мытных органаў, за перыяд 2013-2015 гг. аб'ём увезеных МПА павялічыўся больш як у 6 разоў: калі ў 2013-м гэты лік складаў 1,9 млн, то ўжо ў 2015 г. было ўвезена 11,8 млн пасылак. Пры гэтым пасылкі з-за мяжы прыходзілі ў асноўным з інтэрнэт-крам і толькі для 10% жыхароў краіны.

З 14 красавіка ў выпадку атрымання тавараў, даражэйшых за 22 еўра і (або) цяжэйшых за 10 кг, за кожны «лішні» кілаграм будуць налічаны мытныя пошліны, падаткі па ранейшай стаўцы — 30% ад цаны, але не менш як 4 еўра за 1 кг.

Мытныя плацяжы ажыццяўляюцца атрымальнікам у паштовым аддзяленні, у якім выдаецца пасылка. Інфармаваць адрасата аб неабходнасці выплаты мытных плацяжоў будзе аператар паштовай сувязі. Пры гэтым норма бяспошліннага ўвозу не сумуецца для членаў сям'і, г.зн. кожны можа атрымліваць пасылкі ў межах вызначаных нормаў. Акрамя таго, па-ранейшаму захоўваецца магчымасць бяспошліннага атрымання грашовых сродкаў у лістах у межах сумы, у эквіваленце не большай за 200 долараў ЗША.

Згодна з дакументам, ліміты не распаўсюджваюцца на паштовыя адпраўленні з дзяржаў — членаў ЕАЭС (Расійская Федэрацыя, Рэспубліка Казахстан, Рэспубліка Арменія, Кыргызская Рэспубліка).

Таксама з 14 красавіка тавары ў выпадку ўвозу часцей за адзін раз на тры каляндарныя месяцы на суму звыш 300 еўра і (або) вагой, большай за 20 кг, не будуць залічвацца да тавараў для асабістага карыстання. Пры гэтым нормы бяспошліннага ўвозу тавараў у 1500 еўра і 50 кг працягваюць дзейнічаць. Акрамя таго, з уступленнем у сілу Указа №40 будзе ажыццяўляцца ўлік частаты перамяшчэння тавараў праз мяжу. Набытыя фізічнай асобай у крамах бяспошліннага гандлю тавары будуць таксама ўключацца пры разліку лімітаў увозу тавараў для асабістага карыстання праз аўтамабільныя і чыгуначныя пункты пропуску.




Ва ўказе ёсць і шэраг выключэнняў. Так, тавары, якія ўвозяцца паветраным транспартам, вывезеныя раней і ўвозяцца фізічнымі асобамі назад (пры наяўнасці дакументаў, што пацвярджаюць іх вываз); якія ўвозяцца супрацоўнікамі дыпламатычных прадстаўніцтваў, консульскіх устаноў і іншых міжнародных арганізацый; атрыманыя ў спадчыну, а таксама тыя, што ўвозяцца пры перасяленні на пастаяннае месца жыхарства ў Беларусі, — пошлінамі не абкладаюцца.

Акрамя таго, нормы ўказа не распаўсюджваюцца на тавары, якія былі ва ўжыванні і пры гэтым вывозяцца за межы мытнай тэрыторыі, а пасля ўвозяцца назад у нязменным стане без дакументальнага пацвярджэння іх вывазу (напрыклад, мабільныя тэлефоны, фотаапараты, планшэты, ноўтбукі і інш.), калі іх кошт і вага не перавышае 1500 еўра і 50 кг. Калі ж кошт або вага (важныя абодва паказчыкі) гаджэтаў вышэйшыя за гэтую норму, то пры выездзе з краіны неабходна іх задэклараваць. Дакументы, якія пацвярджаюць вываз тавараў з мытнай тэрыторыі ЕАЭС, уключаюць пасажырскую мытную дэкларацыю, дагавор куплі-продажу, таварны чэк.

У выпадку, калі грамадзянам спатрэбіцца адказы на праблемныя пытанні па новых правілах увозу тавараў, можна звярнуцца ў кол-цэнтры мытняў і Дзяржаўнага мытнага камітэта, якія запрацуюць у найбліжэйшы час. Нумары тэлефонаў можна знайсці на афіцыйным сайце ведамства.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.**
*kryzhevich@zviazda.by*